7. Соловьев А. И. Политология: Политическая теория, политические технологии: Учебник для студентов вузов /А. И. Соловьев – М.: Аспект Пресс, 2003. – 559 с.
8. Хаусхофер К. О геополитике. Работы разных лет. – М.: Мысль, 2001. – 426 с.
9. Хаусхофер К. Геополитическая динамика меридианов и параллелей («Газета Геополитики». – 1943. – № 8. Германия).
10. Haushofer K. Der Kontinentalblock. Op. cit.; Хаусхофер К. Континентальный блок: Москва-Берлин-Токио / Дугин А.Г. Основы геополитики. Указ. соч. – С.825–835.

УДК 94(476):«1859/1914»

# СТАНАЎЛЕННЕ ТАВАРЫСТВАЎ ЦВЯРОЗАСЦІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТСТ

***Сяргей Мяньчэня***
*Мінск, Беларусь*

Артыкул прысвечаны працэсу станаўлення таварыстваў цвярозасці на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзяў. Першыя падобныя арганізацыі ўзніклі на хвалі цвярозага руху 1859 – 1861 гг., але сустрэлі супраціў з боку дзяржавы і былі ліквідаваны, новы этап станаўлення таварыстваў прыходзіцца на канец XIX – пачатак XX ст.

***Ключавыя словы: таварыствы цвярозасці, праваслаўная і каталіцкая царква, устрыманне ад алкаголя***

У канцы XIX – пачатку XX стст. у Расійскай Імперыі адбылося фарміраванне новай стадыі цвярозага руха, які знайшоў сваё адлюстраванне ў выданні антыалкагольнай літаратуры, шырокаму асвятленню праблемы п'янства ў перыядычным друку. Развіццё ідэй цвярозасці па практыцы рэалізавалася ў стварэнні адпаведных таварыстваў.

Стаўленне афіцыйных улад да таварыстваў цвярозасці было неадназначным. Першыя вядомыя у Расійскай імперыі таварыствы цвярозасці ўзніклі ў Ліфляндскай губерні. У 1836 г. пастар Кельбрандт склаў першы статут таварыства цвярозасці, пад якім падпісалася 50 прыхажан, і накіраваў яго на зацвярджэнне губернатару [1, с. 972]. Тады ўлады не толькі не зацвердзілі дакумент, але і забаранілі пастарам весці агітацыю за адмову ад гарэлкі, але паступова цвярозы рух перакінуўся і на літоўска-беларускія губерні. У 1859 г. рух дасягнуў піка развіцця, на тэрыторыі Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай губерні у ім па падліку навукоўцаў прыняло ўдзел каля 475 тыс. чалавек, пераважна з заходняй часткі сучаснай Беларусі [2, с. 55]. Адбылася і інстытуалізацыя руха – мясцовыя каталіцкія святары сталі ствараць таварыствы цвярозасці, У "Историческим очерке состояния Православной церкви в Литовской епархии за время с 1839-1889 гг." адзначалася, што ў 50-я гг. XIX ст. у якасці "подражания католикам", ці хутчэй у супрацьвагу апошнім былі створаны і праваслаўныя таварыствы цвярозасці, якія за актыўную дзейнасць атрымалі ў 1860 г. падзяку ад мітрапаліта Іосіфа, аднак па паведамленням з месцаў, у некаторых таварыствах толькі трэць з запісаных цалкам кінула піць гарэлку [3, с. 484 - 485]. Афіцыйныя улады, як свецкія, так і царкоўныя выступілі супраць дадзеных арганізацый. Мітрапаліт Маскоўскі Філарэт выказваўся, што хоць сама ідэя цвярозасці з'яўляецца добрай, рэалізацыя яе праз стварэнне арганізацый парушае прынцып дабраахвотнасці, а мэта таварыстваў "произвести расстройство в одной из отраслей государственного дохода" [3, с. 487]. Генерал-губернатар Назімаў патрабаваў ад Ковенскага епіскапа ліквідаваць каталіцкія таварыствы, але той адмовіўся. Моцны удар па таварыствам нанёс М. Мураўёў, у выдадзеным ім цыркуляры каталіцкія таварыствы

цвярозасці былі абвешчаны нелегальнымі арганізацыямі, за удзел у якіх уводзілася жорсткая адказнасць. Праваслаўныя таварыствы зніклі яшчэ раней, на працягу 1860 – 1861 гг., у выніку падаўлення цвярозага руху [3, с. 488]. У савецкая гістарыяграфіі падкрэсліваўся народны характар цвярозага руху 1859 – 1861 гг., і пазначалася, што царква не толькі не спрыяла развіццю ідэй цвярозасці, але і тармазіла гэты працэс [4, с. 12].

Першае афіцыйнае таварыства цвярозасці было зарэгістравана ў 1874 г. у с. Дзекалаўка Палтаўскай губерні. У 1882 г. у с. Тацева Смаленскай губерні было створана таварыства "Согласие трезвости" [2, с. 83]. Распачаўся паступовы рост колькасці дадзеных арганізацый. Так, калі ў 1900 г. у Расійскай Імперыі налічвалася прыкладна 155 таварыстваў цвярозасці, то ў 1913 г. – каля 1800, якія аб'яднoўвалі больш за 500 тыс. удзельнікаў [5]. Для распаўсюджвання таварыстваў выдавалася спецыяльная літаратура. Так, у зборніку І.Мардвінава "Общество трезвости, жизнь и работа в нём" прыводзілася паэтапная інструкцыя арганізацыі таварыства, падаваліся прыклады статутаў, абетных грамат, пасведчанняў удзельнікаў, прамовы аб шкодзе п'янства [6].

Росту колькасці таварыстваў цвярозасці спрыяла і царкоўная ўлада. 12 чэрвеня 1909 г. Свяшчэнны Сінод распаўсюджвае ўказ з праэктам аб запрашэнні духавенства да барацьбы з народным п'янствам. У ўказе падкрэслівалася актыўная пазіцыя царквы ў барацьбе з п'янствам у 50-я гг., калі Сінод падтрымаў святароў (што было вельмі спрэчным тэзісам), указ 1889 г., які даручаў не дапускаць дробнага гандлю спіртнымі напоямі на царкоўнай і манастырскай зямлі. Зараз патрабаваліся новыя меры: арганізацыя таварыстваў цвярозасці, брацтваў, царкоўных саветаў, пропаведзі супраць п'янства павінны былі стаць абавязковымі для ўсіх святароў, у семінарыях планавалася стварыць асобны аддзел антыалкагольнай літаратурай у бібліятэках, пры выкладанні гігіены настаўнікам звяртаць увагу на наступствы п'янства, набыць наглядныя дапаможнікі [7]. Гэтыя меры мелі свой эфект, так калі ў 1907 г. было зарэгістравана 84 таварыства, то ў 1909 – 251, у 1910 – 458 [5].

На тэрыторыі сучаснай Беларусі праваслаўныя таварыствы цвярозасці фіксуюцца ў 1889 г. пры Вылеўскай царкве Гомельскага павета (67 удзельнікаў) і пры Бярозкаўскім прыходзе Клімавіцкага павета (70 чал.), у 1890 г. у с. Брашэвічы Кобрынскага павета (70 чал.) , в. Грыцэвічы Слуцкага павета. Першыя тры ў хуткім часе пераcталі існаваць, бо сяляне не падтрымалі ідэю абсалютнай цвярозасці і  не адмовіліся ад спажывання алкаголя па святах [8, с. 9 – 10].

Падрабязнае апісанне таварыства цвярозасці ў Грыцэвічах сустракаецца ў працы М. Грыгор'ева "Русские общества трезвости, их организация и деятельность". Стваральнікам таварыства і яго кіраўніком быў святар М. Петрапаўлаўскі, у лік таварыства ўваходзілі настаўнік Валынцеў, царкоўны стараста Хмялеўскі, валасны старшыня Корсюк, пісар Шмакаў, сяляне Веліч, Магілевіч, Васілеўскі і Грынкевіч. Пры ўступленні ў таварыства служыўся малебен Св. Пятру і Паўлу і даваўся абет цвярозасці; за парушенне яго - вымова, штраф ці выгнанне з таварыства. Члены таварыства павінны былі не ставіць сабе вышэй і не хваліцца сваёй цвярозасцю перад іншымі. У 1890 г. у таварыства запісалася на 1 год і болей - 10 мужчын, на час Вялікага Паста - 40 мужчын; у 1891 г. - на ўсё жыццё: 5 мужчын (м) і 2 жанчыны (ж), на 1 год і болей - 25 м. і 2 ж., на Вялікі Пост - 62 м. і 10 ж.; у 892 г. - на ўсё жыццё: 1 м., на 1 г. і болей - 9 м, і 3 ж., на Вялікі Пост - 20 м. і 2 ж. У 1893 г. - на ўсё жыццё: 2 м., на 1 год і болей -14 м. і 3 ж., на Вялікі Пост - 29 м. У 1891 г. 5 чалавек далі абет не курыць пад час Вялікага Паста. Таварыства мела невялікую чайную, дзе прадавалася гарбата стаканамі па 1 кап. За чатыры гады абет цвярозасці быў парушаны толькі адзін раз [9, с. 17]. Як бачна, большая частка ўдзельнікаў таварыства адмаўлялася ад спажывання алкаголя толькі на пэўны тэрмін.

М. Васовіч падае наступную інфармацыю аб таварыствах цвярозасці на 1910 г.: Гродзенская епархія – 8 (2 створаны ў 1907 г., па 1 – у 1908 і 1910 гг., 4 – у 1909 г.) - 646 чал.; Літоўская епархія – 7 (3 - да 1906, па 1 – у 1907 і 1908, 2 - у 1909 гг.) - 377 чал.; Мінская епархія – 1 (1907 г.) – 60 чал.; Полацкая епархія – 4 (1 – у 1908, 3 – у 1910 г.) – 204 чал. [8, с. 11].

І. Афанасьеў пазначае колькасць таварыстваў цвярозасці ў 5 заходніх губернях на 1 студзеня 1911 г. у памеры 31, якія ахоплівалі 1400 чалавек. Размеркаванне таварыстваў па губернях, а таксама іх характар можна адзначыць па дадзеных наступнай табліцы:

*Табліца 1. Таварыствы цвярозасці на 1 студзеня 1911 г. [5]*

| **Губерня** | **Агульная колькасць таварыстваў цвярозасці** | **Гарадскія** | **Сельскія** | **Царкоўныя** | **Свецкія** | **Колькасць членаў** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленская | 8 | 3 | 5 | 8 | - | 377 |
| Віцебская | 6 | 1 | 5 | 6 | - | 231 |
| Гродзенская | 8 | 3 | 5 | 8 | - | 646 |
| Мінская | 6 | - | 6 | 6 | - | >60 |
| Магілёўская | 3 | 1 | 2 | 3 | - | >86 |
| **Разам** | **31** | **8** | **23** | **31** | **0** | **1400** |

У параўнанні з іншымі рэгіёнамі імперыі колькасць таварыстваў цвярозасці на тэрыторыі беларускіх губерній была самая нізкая, а агульная колькасць іх удзельнікаў саступала адпаведнаму паказчыку амаль па кожнай асобнай губерні Цэнтральна-Чарназёмнага і Цэнтральна-нечарназёмнага рэгіёнаў Расіі (за выключэннем Тульскай губерні – 672 чал.). Асобна ў плане развіцця таварыстваў цвярозасці стаяла Ковенская губерня, дзе налічвалася каля 35000 удзельнікаў літоўскай арганізацыі “Цвярозасць”. Не высокай была і сярэдняя колькасць членаў аднаго таварыства – ад 80 па Гродзенскай губерні да 10 па Мінскай [5]. А вось нізкі працэнт гарадскіх таварыстваў у цэлым адпавядаў агульнадзяржаўнаму паказчыку.

На аснове матэрыялаў І. Мардвінава можна вылучыць больш падрабязную інфармацыю аб месцызнаходжання, колькасці ўдзельнікаў і кіраўніках таварыстваў цвярозасці (Табліца 2). З пералічаных Мардвінавым таварыстваў на тэрыторыі сучаснай Беларусі знаходзілася 16, адно з якіх знаходзілася на стадыі фарміравання. Трэба адзначыць, што частка таварыстваў прытрымлівалася прынцыпаў памеранага спажывання алкаголя, ці абсалютнай адмовы толькі на час Вялікага паста.

*Табліца 2. Таварыствы цвярозасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў 1911 г. (паводле матэрыялаў І. Мардвінава) [6, с. 177 - 227]*

| **Таварыства цвярозасці** | **Месца знаходжання** | **Дата заснавання** | **Кіраўнік** |
|---|---|---|---|
| ***Волчынскае*** | М. Волчын, Гродзенская губ. | 1908 | Св. Яўстафій Паўловіч |
| ***Выдрыцкае*** | В. Выдрыца Барысаўскі павет, Мінская губ. (Крупскі раён) | ? | Святар А. Скаруцкі |
| ***Габінскае*** | В. Габы Віленская губ. (Мядзельскі раён) | ? | Св. Іаан Лявіцкі |
| ***Глыбоцкае*** | М. Глыбокае, Дісненскі павет, Віленская губ. | 29.10.1907 | Св. Мікалай Ігнатовіч |
| ***Грыцэвіцкае*** | В. Грыцэвічы, Слуцкі павет, Мінская губ. (Клецкі раён), | 1890 | Св. М. Петрапаўлаўскі |
| ***Дрысвяцкае*** | Ковенская губ. Браслаўскі раён | ? | Св. Андронік Фёдараў |
| ***Есьманскае*** | Эсьмоны Барысаўскі павет, Мінская губерня, (Бялыніцкі раён), | ? | Св. Ф. Багданоўскі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| ***Іаана-Прадцечанскае*** | Макрянская царква, в. Мокрае, Быхаўскі павет, Магілёўская губ | 1908 | Св. Іаан Бародзіч |
| ***Касуцінскае*** | В. Касута, Віленская губ. (Вілейскі раён) | ? | Св. Мікалай Пятроўскі |
| ***Касарыцкае*** | В. Касарычы, Бабруйскі павет, Мінская губ. (Глускі раён) | ? | ? |
| ***Аздячскае*** | Аздзяцічы, Барысаўскі павет, мінская губ. Барысаўскі раён | 1907 | Св. Міхаіл Шалковіч |
| ***Арэхаўскае*** | М. Арэхава, Лепельскі павет, Віцебская губ. (Ушацкі раён) | ? | ? |
| ***Прылепскае*** | Свята-Георгіеўская царква, Астрашыцкі гарадок, Мінскі павет | ? | ? |
| ***Райчанскае*** | В. Райцы, Навагрудскі павет, Мінская губ. (Карэліцкі раён) | ? | Св. А. Валасовіч |
| ***Раваніцкае*** | Раванічы, Ігуменскі павет, Мінская губерня (Чэрвеньскі раён) | ? | Св. Г. Ташкоў |
| ***Селявіцкае*** | Селявічы, Слонімскі павет, Гродзенскай губ. (Слонімскі раён) | ? | на стадыі фармавання Св. П. Агіцкі |

Найбольш поўная інфармацыя прысутнічае па Глыбокскаму таварыству, якое пазначаецца ў каментарыях ледзь не як адзінае, якое мела зацверджаны статут, асновай якога стаў статут Аляксандра-Неўскага таварыства ў Санкт-Пецярбургу [6, с. 187]. Цікавым фактам з'яўляецца ўпамінанне свецкага таварыства – Арэхаўскае таварыства цвярозасці інтэлегентаў (Лепельскі павет, на сучасны стан – в. Арэхаўна Ушацкага раёна Віцебскай вобласці), але знайсці больш падрабязную інфармацыю аб ім не атрымалася [6, с. 209].

З архіўных крыніц трапляецца справа таварыства ў Эсьмонах (Бялыніцкі раён). Члены таварыства – прыхажане мясцовай царквы – склалі ў 1910 г. прыгавор аб закрыцці ў Эсьмонах піцейных устаноў, але дадзены дакумент не меў юрыдычнай моцы і не быў зацверджаны ўладамі, бо правамоцнымі лічыліся толькі пастановы валасных ці местачковых сходаў, а з ліку тых, хто падпісаў пратакол, толькі 6 асоб з'яўляліся жыхарамі мястэчка [10, арк. 156].

"Наша Ніва" у 1908 г. паведамляе аб спробе стварэння таварыства цвярозасці ў м. Малеч (Пружанскі павет): "3 гады таму (1905 – М.С.) поп узяў прысягу ад сваёй парафіі, каб не пілі гарэлку, мужыкі пратрымаліся 2 тыдні і сарваліся". Калі праэкт праваліўся, мясцовыя жыхары пастанавілі на сходзе забараніць продаж (маецца на ўвазе беспатэнтны), а штраф за невыкананне накіроўваць на карысць грамады [11, с. 5 – 6]. Падобнае рашэнне был прынята сялянамі в. Вялікая Ліпа (Навагрудскі павет), дзе для нагляду за нелегальным продажам было абрана 4 чалавека, штраф – 25 руб. – таксама планавалася накіроўваць на грамадскія патрэбы [12, с. 7].

У 1914 г. таварыства цвярозасці было заснавана ў Горках, але колькасць членаў яго была нязначная, большую частку складалі жанчыны. Самі мясцовыя жыхары тлумачылі свае адносіны да дадзенай з'явы наступным чынам: "Пыталі чаму не запісваюцца, адказваюць – без гарэлкі жыць нельга, трэба піць яе піць, на хрэсьбінах, памінках,

хаўтурах, барышах, хрэсным ходзе, і іншы раз купіўшы ці прадаўшы. Іншыя кажуць – калі не піць – то ўсім. Тады яе і рабіць не трэба” [13, с. 4].

Вялася справа па ўкараненню ідэй цвярозасці і каталіцкімі святарамі, але часцей у неарганізаванай форме – без стварэння таварыстваў. Так у вёсцы Чорная Весь (Гродзенскі павет) барацьбу з п’янствам узначаліў ксёндз Шапель. Па яго ініцыятыве ў воласці былі скасаваны не толькі манапольkі, але і піўныя, была арганізавана цвярозая варта, якая сачыла за беспатэнтным гандлем у воласці і на чыгунцы [14, с. 3].

Развіццё сеткі каталіцкіх таварыстваў цвярозасці непакоіла ўлады, якія лічылі стварэнне легальных таварыстваў будзе садзейнічаць распаўсюджванню польскага ўплыва. Так, у 1911 г. Міністэрства ўнутраных спраў зацвердзіла статут каталіцкага таварыства “Цвярозасць”, гурткі якога ахоплівалі тэрыторыю Ковенскай, Курляндскай, Сувалкскай і Віленскай губерній. Стаць членамі арганізацыі маглі каталікі абодвух палоў, у тым ліку і непаўналетнія. Члены арганізацыі падзяляліся на абстытентаў, якія не спажывалі ніякіх напояў, што утрымлівалі алкаголь, і цвярозаннікаў, якія не спажывалі моцных напояў, а з астатнімі прытрымліваліся памеранасці. Непаўналетнія не мелі права голаса, не маглі быць абранымі ў кіруючыя органы арганізацыі, ім забаранялася праводзіць агітацыю. Члены таварыства павінны былі весці хрысціянскі лад жыцця, спрыяць распаўсюджванню цвярозасці, устрымацца ад моцных напояў і не прапаноўваць іх іншым [15, арк. 2 – 3]. У 1914 г. кіраўніцтва арганізацыі звярнулася ў Дэпартамент духоўных спраў з дазволам распаўсюдзіць сваю дзейнасць на іншыя губерні, у першую чаргу - Гродзенскую, аднак улады ім адмовілі. 30 лістапада 1914 г. Ковенскі губернатар у рапарце ў Дэпартамент пазначаў, што мэта “Цвярозасці” – аб’яднанне на рэлігійнай аснове літоўскага і польскага насельніцтва, а далейшае распаўсюджванне дзейнасці “даст возможность объеденить белорусов, поляков и литовцев, используя католическую веру, в одну сильносплочённую ячейку”. Негатыўны водгук атрымалі і кіраўнікі таварыства: “во главе отделений ксендзы-фанатики, которые пользуются безграничным к себе доверием населения и развивают в нём тот же фанатизм, скрыто направляя против задач Русского Правительства” [15, арк. 9 – 10]. Аднак у чым менавіта праяўлялася губернатар не пазначыў. Яшчэ больш прынцыпова выказаўся 30 мая 1915 г. Гродзенскі губернатар, які адзначыў, што арганізацыя пад выглядам правядзення ідэй цвярозасці будзе рэалізоўваць паланізатарскія мэты. У плане цвярозасці ў сувязі з ваенным становішчам, працягваў ён, “необходимости в частной инициативе нет, потребности населения удовлетворяет Попечительство о народной трезвости” [15, арк. 11].

Прынцып самаарганізацыі грамадства адначыўся і на прыкладзе вёскі Горбава (Аршанскі павет, сёння Горбава 1, Лёзненскі р-н), дзе жыхары самі арганізавалі таварыства цвярозасці, але не дачакаліся яго зацвярджэння ўладамі [16, с. 5], як і сяляне вёскі Слабада (Ільінская воласць Віленскага павета). У вёсцы Ліскава цвярозасць распаўсюдзілася праз тое, што грамада арганізавала сельска-гаспадарчае таварыства, хаўрусную краму, ашчадную касу, народны дом, чытальню, пажарную каманду і прытулак для дзяцей, старых, бяздомных. Як вынік, “цяпер ніхто з ліскоўцаў ня цягнецца дзе колечы да шынку, ці пад манаполь, а ўсякую вольную ад працы хвілю, калі не ў сваей хаце, то праводзіць у народным доме, або ў бібліятэка-чытальні, дзе знойдзе сабе разрывак і карысць разам” [17, с. 4]. Ліскава лакалізуецца аўтарам (подпіс “Liskouski”) артыкула ў Магілёўскай губерні, але на сённяшні час на тэрыторыі Беларусі ёсць толькі адна вёска з такой назвай, якая знаходзіцца ў Клецкім раёне.

Такім чынам, у працэсе станаўлення таварыстваў цвярозасці на тэрыторыі Беларусі ў адзначаны перыяд можна вылучыць 2 этапа: першы, звязаны з цвярозым рухам 1859 – 1861 гг., калі таварыствы ўзнікалі стыхійна і былі ліквідаваны дзяржавай; другі, у межах цвярозага руху канца XIX – пачатку XX ст., праходзіў пад дзяржаўным кантролем. Асаблівасцю дадзенага працэса на тэрыторыі Беларусі з’яўлялася нязначная колькасць падобных арганізацый і колькасць іх удзельнікаў, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай Імперыі. Гэта можна патлумачыць прыхільнасцю насельніцтва да памеранага спажывання алкаголя, пры адным з самых нізкіх паказчыкаў спажывання гарэлкі на душу

насельніцтва ( 0,24 вядра у сельскай мясцовасці, пры сярэднім 0,41 па імперыі, 0,94 у гарадах (сярэдні - 1,37) ) [2, с. 21], а таксама недаверам дзяржавы да каталіцкіх таварыстваў. У такіх умовах насельніцтва знайшло выйсце ў самаарганізацыі.


1. Труды Первого Всероссийского съезда по борьбе с пьянством (Санкт – Петербург, 28 декабря 1909 – 6 января 1910 г.), Санкт-Петербург, 1910. – 1603 с.
2. Протько, Т. С. В борьбе за трезвость / под ред. М. О. Бича. – Минск: Наука и техника, 1988. – 162 с.
3. Извеков Н. Д. Исторический очерк состояния Православной церкви в Литовской епархии за время с 1839-1889 гг. / Н.Д. Извеков. – Москва: Печатня А.И. Снегирёвой, 1899. – 522 с.
4. Из истории борьбы за трезвость на Гроденщине / Правление Гродненской областной организаци общества "Знание", Правление Гродненской областной организации добровольного общества любителей книги, Гродненский областной совет добровольного общества борьбы за трезвость. – Гродно, 1986. – 16 с.
5. Афанасьев, А.Л. Трезвенное движение в России в период мирного развития. 1907-1914 годы: опыт оздоровления общества / А.Л. Афанасьев // Твереза література [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://www.literatura.tvereza.info/01/Afanasiev/td1907-1914.html. Дата доступа: 25.10.2018.
6. Мордвинов, И. Общество трезвости, жизнь и работа в нём / И. Мордвинов. – Санкт-Петербург: Типография Александро-Невского общества Трезвости, 1911. – 227 с.
7. От Святейшего Правительствающего Синода о борьбе с пьянством в народе // Гродненские епархиальные ведомости – 1909. – 26 июля. – с. 301 – 302.
8. Восович, С. М. Роль православного духовенства в утверждении трезвого образа жизни в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. / С.М. Восович // Вестник Академии МВД Республики Беларусь. – 2008. - № 1. – с. 9 – 11.
9. Григорьев, Н.И. Русские общества трезвости, их организация и деятельность в 1892 – 1893 гг. / Н.И. Григорьев. – Санкт-Петербург: Типография П.П. Сойкина, 1894. – 79 с.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Мінск). – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 7943.
11. Наша ніва. – 1908. – № 9.
12. Наша ніва. – 1908. – № 7.
13. Наша ніва. – 1914. – № 11 – 12.
14. Наша ніва. – 1914. – № 8.
15. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Гродна). – Ф. 1. – Воп. 27. – Спр. 2951.
16. Biełarus. – 1913. – № 5.
17. Biełarus. – 1913. – № 31.


УДК 94(476):[316.334.3+316.334.55]:338.23

# РОЛЬ МИРСКИХ ПОВИННОСТЕЙ В ФИНАНСИРОВАНИИ МЕРОПРИЯТИЙ СОЦИАЛЬНОЙ ПОЛИТИКИ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ В ПОРЕФОРМЕННЫЙ ПЕРИОД

***Надежда Моторова***
*Минск, Беларусь*

В статье охарактеризована роль мирских повинностей в финансировании мероприятий социальной политики на территории белорусских губерний в пореформенный период. На основании статистических данных определена доля расходов на социальные цели в структуре мирских платежей. Сделан вывод о вспомогательном характере мирских повинностей в финансировании социальной сферы.

***Ключевые слова: мирские повинности, крестьяне, социальная политика, белорусские губернии***